Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. СУБОТА № 210 (28320)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Санаторыі — наш брэнд?**

СТАР. 4



**Святар-відэаблогер**

СТАР. 9



**У закулiссі «Лістапада»**

СТАР. 17

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «НА ШЛЯХУ ПАБУДОВЫ ІНТЭГРАЦЫЙНЫХ ПРАЕКТАЎ ТРЭБА ПАСЛЯДОЎНА І РАШУЧА РУХАЦЦА НАПЕРАД»

**Правядзенне ў Мінску пасяджэнняў кіраўнікоў урадаў Еўразійскага эканамічнага саюза і Садружнасці Незалежных Дзяржаў у Беларусі разглядаюць як прызнанне актыўнай інтэграцыйнай палітыкі краіны, заявіў Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы з кіраўнікамі ўрадавых дэлегацый ЕАЭС і СНД, перадае карэспандэнт БЕЛТА.** СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

■ Полюс інтарэсаў

## Не імідж, а практычная неабходнасць

### Стартавала дзявятая беларуская антарктычная экспедыцыя



Фота БЕЛТА.

**ПАЛЯРНІКІ сустрэліся з грамадскасцю, каб расказаць пра досвед мінулых экспедыцый і ва ўрачыстай абстаноўцы пачаць чарговую. Сёлета навуковая супольнасць краіны адзначае юбілей — ужо дзесяць гадоў Беларусь вядзе рэгулярныя навуковыя і экспедыцыйныя даследаванні ў Антарктыцы. Якія планы навукоўцаў на бліжэйшыя гады і што будзе зроблена непасрэдна падчас экспедыцыі?**

— Пачнецца рэалізацыя дзяржаўнай праграмы палярных даследаванняў на 2016—2020 гады, — расказаў **начальнік Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксей ГАЙДАШОЎ.** — У адрозненне ад папярэдніх дзвюх праграм, мы паставілі вельмі амбіцыйныя мэты, дасягнуць якіх разлічваем ужо напрыканцы пяцігодкі. Па-першае, плануецца завяршыць будаўніцтва першай чаргі Беларускай антарктычнай станцыі. Па-другое, мы будзем падаваць заяўку на атрыманне статусу кансультатыўнага боку Дамовы аб Антарктыцы. Па-трэцяе, збіраемся ўпершыню правесці зімовачныя круглагадовыя мерапрыемствы ў 2019—2020 або ў 2020—2021 гадах. Безумоўна, будзе рэалізоўвацца і новая навуковая праграма, якая складаецца з даследаванняў па пяці кірунках. СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ



**Тарас НАДОЛЬНЫ, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Сёння перад намі стаіць задача ўтрымаць інфляцыю на ўзроўні 12%. У 2017 годзе мы плануем выйсці на 9%, да 2020 года атрымаць вынік, які стане самым лепшым за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі, — 5%. Той інструмент манетарнага таргетавання, які мы цяпер выкарыстоўваем для кантролю шырокай грашовай масы, стварае ўсе перадумовы, каб мы дасягнулі такога выніку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9065 | ▼ |
| Еўра | 2,0820 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0306 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

16210

■ Ёсць нагода

Сяргей АБЛАМЕЙКА:

## «Прысутнасць БДУ ў рэйтынгах — наша візітная картка»

**«Апошнія гады я прытрымліваюся прынцыпу «жыццё ўдалося, але яшчэ рана скідваць хуткасць», — прызнаўся ў адным са сваіх інтэрв'ю рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, аўтар больш як 600 навуковых работ, доктар тэхнічных навук, прафесар Сяргей АБЛАМЕЙКА. Зусім нядаўна Сяргей Уладзіміравіч адзначыў свой 60-гадовы юбілей, а 30 кастрычніка 95-годдзе адзначыць галоўная ВНУ краіны, якую ён узначальвае з 2008 года. Восень атрымалася для кіраўніка БДУ надзвычай клопатнай, тым не менш ён не адмовіў у інтэрв'ю нашаму выданню...**



Фота Надзеі БУЖАН.

### АД СТУДЭНТА — ДА РЭКТАРА

***— Сяргей Уладзіміравіч, вы скончылі механіка-матэматычны факультэт БДУ ў 1978 годзе. А роўна праз трыццаць гадоў вас, вучонага з сусветным іменем, запрасілі ўзначаліць сваю альма-матар. Прызнайцеся, што для вас больш цікава: займацца навукай ці выхоўваць новае пакаленне людзей з нестандартным мысленнем? І ці часта вам даводзіцца лавіць сябе на думцы «а вось у мае часы...»?***

— Я і цяпер працягваю займацца навукай, але, канешне, у значна меншай ступені. А, можа, усяму свой час? Рухаць навуку наперад павінна найперш моладзь. Ёсць меркаванне, што асноўныя адкрыцці робіцца да 40 гадоў, а потым ты ўжо пераважна абагульняеш, кансультуеш, кіруеш іншымі. Спадзяюся, што свой уклад у навуку я ўжо зрабіў. Да таго ж пераход ад навукі да адміністрацыйнай працы ў мяне атрымаўся досыць плаўны, паколькі ў Акадэміі навук я ўзначальваў Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі, а да гэтага працаваў намеснікам дырэктара інстытута, таму адміністрацыйнай працы мне і там хапала. Праўда, тут яе яшчэ больш *(смяецца. — **Аўт.**)*, маштабы зусім іншыя... СТАР. 5